Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

29.12.2016

**Міністру замежных спраў Рэспублікі Польшча**
**Вітальду Вашчыкоўскаму**

**Зварот Каардынацыйнага камітэта Беларускай нацыянальнай платформы**
**Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

## Пра будучыню тэлеканала «Белсат»

*Паважаны спадар міністр,*

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, аб'яднаныя ў рамках Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства занепакоеныя будучыняй тэлеканала «Белсат».*

У першую чаргу, мы б хацелі выказаць шчырую ўдзячнасць Рэспубліцы Польшча за шматгадовую палітычную і фінансавую падтрымку існавання тэлеканала «Белсат» з 2007 года як незалежнага тэлевізійнага праекта, які прапануе беларускаму тэлегледачу інфармацыю і ацэнкі, свабодныя ад уплыву прадстаўнікоў улады.

Дзякуючы падтрымцы Польшчы, роўна як Еўрапейскага Саюза і іншых партнёраў, якія падзяляюць каштоўнасць свабоды слова, тэлеканал «Белсат» змог завяваць сваё месца і аўдыторыю ў Беларусі ў няпростых умовах інфармацыйнай несвабоды і дыскрымінацыі незалежных СМІ. Важна таксама адзначыць, што абсалютная большасць уласных праграм тэлеканала выpабляецца сіламі беларускіх журналістаў, а таксама з запрашэннем шырокага спектру экспертаў, лідэраў меркаванняў і проста актыўных грамадзян нашай краіны.

За мінулыя 9 гадоў тэлеканал «Белсат»:

- стаў важнай часткай незалежнай медыя-прасторы Беларусі, нягледзячы на шматразовыя адмовы ў яго афіцыйнай рэгістрацыі і ціск на журналістаў канала за іх прафесійную дзейнасць з боку беларускіх уладаў;

- склаўся як важны інструмент фармавання беларускай ідэнтычнасьці на аснове праеўрапейскіх каштоўнасцей;

- зарэкамендаваў сябе як праект у няспынным развіцці, які здольны да чулага рэагавання на падзеі, што адбываюцца ў навакольнай рэчаіснасці, а таксама пошуку новых форм і сродкаў дыялогу з гледачом і рознымі групамі інтарэсаў у беларускім грамадстве.

У сувязі з гэтым нас вельмі турбуе апублікаваная ў розных СМІ Польшчы і Беларусі інфармацыя аб намеры польскага ўраду істотна скараціць фінансаванне тэлеканала «Белсат», а таксама адмовіцца ад вяшчання на беларускай мове. Наяўнасць невялікага беларускамоўнага тэлеканала, стымулюючага нацыянальную і грамадзянскую самасвядомасць многіх жыхароў нашай краіны, бачыцца значна больш правільным адказам на актуальныя выклікі інфармацыйнай вайны, чым агучаныя ў медыя альтэрнатывы. Перспектыва закрыцця канала, якая таксама абмяркоўваецца, прывядзе да яшчэ больш негатыўных наступстваў, у прыватнасці сур'ёзнаму паслабленню супраціву агрэсіўнай прапагандзе ідэалогіі рускага свету ў Беларусі.

Безумоўна, права рашэння лёсу тэлеканала належыць тым, хто яго засноўваў і падтрымліваў усе гэтыя гады - польскаму ўраду і іншым міжнародным партнёрам. Разам з тым, было б няправільным недаацэньваць ўклад у існаванне «Белсата», зроблены беларускімі стэйкхолдерамі - экспертамі, журналістамі, прадстаўнікамі арганізацый грамадзянскай і культурніцкай супольнасцей нашай краіны. У сувязі з гэтым нам бачыцца дзіўным, няправільным і неапраўданым, што беларускія партнёры фактычна пазбаўлены права голасу і не запрошаныя да абмеркавання будучыні тэлеканала «Белсат».

Падобнага роду рашэнні маюць высокую важнасць для многіх суб'ектаў унутры Беларусі, могуць у значнай ступені адбіцца на ўнутрыпалітычным кантэксце краіны. Грамадзянская супольнасць Беларусі адкрыта і зацікаўлена ў абмеркаванні лёсу тэлеканала «Белсат» разам з іншымі зацікаўленымі бакамі, а таксама чакае больш поўнага ўключэння ў гэты працэс шырокага спектру беларускіх партнёраў.

*Каардынацыйны камітэт БНП ФГС УП*

*Беларуская нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства заснавана ў ліпені 2010 года, аб'ядноўвае на аснове пра-еўрапейскіх каштоўнасцяў больш за 80 арганізацый і ініцыятыў розных сфер дзейнасці.*

*Кантакт: Улад Вялічка, са-старшыня Кіруючага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства, каардынатар Форума па Беларусі*
*+375 29 6120973, u.vialichka@gmail.com*